ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

№ 17 (1151)
ЧАЦВЕР, 6 лістапада 2008 г.
*Выходзіць два разы ў месяц*
*Цана дагаворная*

*Газета заснавана ў верасні 1969 года*

## На Савеце універсітэта

### АД ЗАДАЧ РЭАЛЬНЫХ ДА ГЛАБАЛЬНЫХ

Фізіка мікрасвету, фізіка фундаментальных з'яў, якія адбываюцца ў прыродзе, паглыблена вывучаецца і даследуецца вучонымі нашага універсітэта ў рамках навукова-педагагічнай школы «Фізіка высокіх энергій». Аб яе гісторыі, развіцці, дасягненнях і перспектывах на пасяджэнні кастрычніцкага Савета універсітэта расказаў і наглядна паказаў на слайдах навуковы кіраўнік школы д.ф.-м.н, прафесар М.В.Максіменка. Ён акцэнтаваў увагу на вялікім вопыце работы, які назапашаны супрацоўнікамі кафедры тэарэтычнай фізікі ГДУ па правядзенні тэарэтычных і эксперыментальных даследаванняў у галіне фізікі высокіх энергій. Адзначалася таксама, што школа ўпэўнена заявіла аб сабе не толькі ў нашай рэспубліцы, у Расіі, але і на міжнародным узроўні. Дастаткова сказаць, што даследчыкі з ГДУ, якія актыўна ўзаемадзейнічаюць з Аб'яднаным інстытутам ядзерных даследаванняў (г. Дубна), прынялі ўдзел у ажыццяўленні грандыёзнага міжнароднага праекта па стварэнні вялікага адроннага калайдэра – самай буйной эксперыментальнай устаноўкі ў свеце, прызначанай для разгону пратонаў і цяжкіх іонаў.

Дзейнасць навуковай школы цесна звязана і з вучэбным працэсам: на фізічным факультэце вядзецца падрыхтоўка маладых спецыялістаў, здольных вырашаць канкрэтныя тэарэтычныя і эксперыментальныя задачы ў галіне фізікі высокіх энергій.

### НАБОР І НЕДАБОР

Як прайшла прыёмная кампанія-2008 ва універсітэце, аб рабоце, праведзенай па арганізацыі ўступных іспытаў і выніках набору студэнтаў у ГДУ, расказаў у сваім выступленні прарэктар па вучэбнай рабоце І.В.Семчанка. Шматлікія статыстычныя дадзеныя, праілюстраваныя на слайдах, далі поўнае ўяўленне аб узроўні ведаў абітурыентаў, якія аспрэчвалі права стаць студэнтамі нашай вну, аб прахадных балах, конкурсе на кожную спецыяльнасць. Сёлета самы высокі конкурс быў сярод тых, хто паступаў на юрыдычны факультэт – 6,35 чал. на месца, а прахадны бал – на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» – 272. Невыкананым аказаўся план набору на спецыяльнасці «Гісторыя. Англійская мова» (0,88 чал. на месца) і «Беларуская філалогія» са спецыялізацыяй «Англійская мова» (0,75 чал.).

### БУДЗЕ СТЫМУЛ ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ

Па інфармацыі прарэктара па навуковай рабоце А.М. Дзямідзенкі Саветам рэкамендавана да заахвочвання спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя «Сеткавыя тэхналогіі і мультымедыя», якая працуе пры кафедры АСАІ. Яе ўдзельнікі ўпэўнена заяўляюць аб сабе ў навукова-даследчай рабоце: публікуюць артыкулы ў навуковых выданнях, атрымалі акты на ўкараненне сваіх распрацовак у вытворчасць. Члены Савета рэкамендавалі лабараторыю да заахвочвання спецыяльным фондам Прэзідэнта РБ, што з'явіцца вялікім стымулам для актывізацыі далейшай творчай дзейнасці здольных студэнтаў, умацавання матэрыяльнай базы СНДЛ.

### НОВАЕ СТРУКТУРНАЕ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЕ

У Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў адбыліся арганізацыйныя змены. У яго склад увайшло новае структурнае падраздзяленне – «Цэнтр інжынернай адукацыі, аховы працы і прамысловай бяспекі». Аб гэтым членаў Савета праінфармаваў дырэктар ІПК і ПК А.А. Малахаў. Асноўная мэта Цэнтра – навучанне, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў па рабочых прафесіях. Універсітэт прымае на свой баланс будынак Цэнтра па вул. Інтэрнацыянальнай, 2.

### ЯШЧЭ АДЗІН ФІЛІЯЛ

Разгледжана пытанне аб адкрыцці філіяла кафедры лесагаспадарчых дысцыплін ГДУ на базе Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Як адзначыла дэкан біяфака В.М. Храмчанкова, гэта дасць факультэту добрую магчымасць пашырыць навуковую і вытворчую базы для правядзення студэнцкіх практык, выкарыстоўваць для вучэбных мэт базу Каранёўскага лясніцтва, у рэцэнзіраванні дыпломных работ выпускнікоў спецыяльнасці «Лясная гаспадарка» змогуць прыняць удзел навукоўцы Інстытута лесу.

### РЫХТУЕМСЯ ДА ЮБІЛЕЮ

Універсітэт – напярэдадні знамянальнай даты – свайго 40-годдзя. Як будзе святкавацца юбілей, як да яго неабходна падрыхтавацца калектыву ГДУ, гаварыў рэктар А.У. Рагачоў. У сярэдзіне мая наступнага года пройдзе шэраг прымеркаваных да 40-годдзя пераўтварэння педагагічнага інстытута імя В.П. Чкалава ва універсітэт мерапрыемстваў: навуковая канферэнцыя выкладчыкаў і студэнтаў, адбудзецца ўрачыстае адкрыццё юбілейнай музейнай экспазіцыі, будуць падрыхтаваны і выдадзены святочныя выпускі часопіса «Известия ГГУ им. Ф. Скорины», зборнікаў творчасці выпускнікоў нашай alma-mater і інш.

На Савеце разгледжаны іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.



**Лепшыя студэнты універсітэта – выдатнікі вучобы, актыўныя ўдзельнікі НДРС, грамадскія актывісты штогод заахвочваюцца стыпендыямі кіраўніка дзяржавы. Па выніках мінулага навучальнага года такіх стыпендый з уручэннем пасведчанняў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў былі ўдастоены Вадзім Сівянкоў, Іна Сідралёва (факультэт фізвыхавання), Станіслаў Драбышэўскі (фізічны факультэт), Наталля Баброва (факультэт замежных моў), Яна Мелер і Іван Корхаў (эканомфак).**

**На Савеце універсітэта рэктар А.У. Рагачоў ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў лаўрэатам адпаведныя пасведчанні.**

**На здымку: узнагароду атрымлівае Іван Корхаў.**

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## ИЗУЧАЙ НЕМЕЦКИЙ С DAAD!

**Уже не первый год ГГУ активно сотрудничает с Германской службой академических обменов (DAAD), и студенты, аспиранты, преподаватели, научные сотрудники университета имеют возможность на конкурсной основе получить стипендию этой организации на обучение, стажировку или осуществление научно-исследовательской деятельности в одном из немецких вузов.**

С условиями участия в конкурсе, сроками и процедурой подачи и оформления соответствующих документов можно было познакомиться во время традиционной ежегодной презентации стипендиальных программ DAAD в нашем университете. Она прошла недавно в конференц-зале под эгидой Информационного бюро Германской службы академических обменов, которое располагается в Минске, при участии его руководителя Михаэля Клееса.

Открывая мероприятие, начальник отдела международных связей Л.И. Протченко отметила, что четверокурсница факультета иностранных языков Алла Николаенко стала обладательницей семестровой стипендии DAAD и в настоящее время совершенствует знания в области германистики и немецкого языка в университете им. Фридриха Шиллера в г. Йена. Студент экономфака Станислав Морозов, получив грант на прохождение летних вузовских курсов, после завершения 2007 – 2008 учебного года в период каникул смог изучать немецкий, посещать занятия по страноведению в выбранном им самим вузе Германии.

В свою очередь Михаэль Клеес рассказал присутствующим на презентации студентам факультета иностранных языков специальности «Немецкий язык», будущим правоведам и экономистам и о других стипендиальных программах DAAD, предоставляющих возможность «заслужить» в том числе научно-исследовательскую стипендию для аспирантов и молодых ученых, стипендию последипломного обучения для выпускников вузов всех специальностей, стипендию последипломного обучения ERP для выпускников вузов экономических специальностей. Можно также стать участником специальной программы для изучающих гуманитарные, социальные и общественные науки, в составе студенческой группы совершить ознакомительную поездку в Германию, пройти там учебную практику.

В рамках познавательной встречи все желающие смогли написать тест по немецкому языку, который определяет уровень владения «соискателя» данным языком и является одним из этапов конкурса на получение той или иной стипендии DAAD.

### РАВНЕНИЕ – НА ЛУЧШИХ!

Советом специального фонда Президента Республики Беларусь по поддержке одаренных учащихся и студентов в первом семестре текущего учебного года поощрены четыре отличника учебы, активные участники научной и общественной жизни нашего университета. Стипендии главы государства назначены пятикурсникам факультета иностранных языков Оксане Васильевой, Юлии Макаревич, Наталье Морозовой, а также Алексею Ворожуну с экономфака.

Анонс

### «Нам этот мир завещано сберечь»

**Так назывался международный славянский форум студенческой молодежи трех республик – России, Беларуси и Украины, который прошел в конце октября в г. Брянске. В нем приняла участие делегация нашего университета.**

*(Подробности читайте в следующем номере нашей газеты.)*

## ВЛКСМ – 90 лет

### СЛАВНЫЕ СТРАНИЦЫ СОЗИДАНИЯ

В конце октября в г. Минске во Дворце Республики состоялся XXXX съезд общественного объединения «БРСМ», приуроченный к 90-летию Всесоюзного Ленинского Коммунистического Союза Молодежи – крупнейшей в мире молодежной организации, внесшей огромный вклад в социально-экономическое и культурное развитие Советского Союза, БССР. Форум собрал более 1400 делегатов из всех регионов страны, ветеранов комсомольского движения от каждой области, а также зарубежных партнеров БРСМ из молодежных организаций России, Украины, Венесуэлы, Кубы, Китая, Венгрии, Армении и других стран.

На повестке дня стояли вопросы, связанные с определением приоритетных направлений деятельности молодежного союза на ближайшие три года, обеспечением эффективного участия молодых людей в общественно-политической и культурной жизни республики, развитием позитивных инициатив и поддержкой талантливой молодежи в процессе реализации национальных, государственных и региональных программ.

В работе съезда участвовала представительская делегация Гомельской области. В ее составе находился и ректор нашего университета А.В. Рогачев.

### НА СТАЛІЧНАЙ СЦЭНЕ – НАША «ДЗЯННІЦА»

Хутка ў рэспубліцы будзе адзначацца 65-я гадавіна вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да гэтай знамянальнай даты ідзе актыўная падрыхтоўка, а некаторыя тэматычныя мерапрыемствы праводзяцца ўжо зараз. Адно з іх адбылося 31 кастрычніка ў Мінску, у Палацы Рэспублікі, куды на справаздачны канцэрт з'ехаліся шматлікія творчыя калектывы і салісты Гомельскай вобласці.

У сталіцы пабывала і дэлегацыя ад нашага універсітэта на чале з дырэктарам Маладзёжнага комплексу А.В. Лысянковым. У яе ўвайшлі прафсаюзныя лідэры ўсіх факультэтаў, актывісты БРСМ, студэнты, якія вызначыліся ў вучобе, грамадскай рабоце, мастацкай самадзейнасці. Яны сталі сведкамі своеасаблівага форуму мастацтва нашай вобласці. На галоўнай сцэне краіны была дастойна прадстаўлена творчасць і нашай вну. Гледачы цёпла ўспрынялі выступленне народнай харавой капэлы «Дзянніца».

### *З узнагародай!*

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны:

**КАПШАЙ Наталля Паўлаўна** – дацэнт кафедры рускай і сусветнай літаратуры;

**МАКСІМЕНКА Мікалай Васільевіч** – д.ф.-м.н., прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі;

**СІЗОНЕНКА Уладзімір Анатольевіч** – дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

# ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

## «Душа, сатканая з надзей»

### (Да юбілею Віктара Ярца)



Ёсць паэты, якія ўжо ад нараджэння адчуваюць свет ва ўсім багацці гукаў і колеравых адценняў. І гэта не можа не адбіцца на іх асобасным і мастацкім самавыяўленні. Менавіта да такіх творцаў і адносіцца дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.У. Ярац. Сціпласць і добразычлівасць, непаўторнасць духоўнага свету, уменне прымаць рэчаіснасць ва ўсіх яе заканамерных і непрадказальных праявах, здольнасць здзіўляцца адзінкаваму і тыповаму ў іх вызначае асноўны кірунак творчых памкненняў паэта.

Нарадзіўся Віктар Уладзіміравіч Ярац 23 кастрычніка 1948 года ў пасёлку Красны Мост Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Пасля заканчэння Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (1970 г.) працаваў у рэдакцыях раённых газет і на Гомельскай студыі тэлебачання. З 1972 года – у Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Друкуецца з 1966 года.

Пагартаем яго зборнікі «Уваходзіны» (1976 г.), «Добрыца» (1989 г.), «Дняпроўскі бакен» (1992 г.), «Беражанкі» (1998 г.), паэму «Там, дзе сівізна нябёс» (2006 г.). Нават з гэтых назваў можна зразумець, што паэзія В. Ярца ціхая, сціплая, мілагучная і з разнастайнай тэматыкай: радзіма, прырода, каханне… Тое, што можна сустрэць у многіх паэтаў, мы бачым і ў творчасці В. Ярца, але тут – свая праўда, сваё бачанне свету, свая індывідуальнасць. Непаўторнасць яго паэзіі прыцягвае чытача, прымушае вяртацца зноў і зноў да вершаў паэта. І гэта невыпадкова, бо яго «душа хлусіць не ўмее». І калі творы паэта хочацца чытаць і перачытваць, калі на памяць ўзгадваюцца яго радкі – ці не гэта і з'яўляецца шчасцем для самога творцы?

Лірычны герой паэта часта вяртаецца да згадак маленства і перажытага ў юнацтве. Якраз яны пакінулі ў яго душы той промень, што асвечвае ўсё далейшае жыццё. Ён жыве, як загадвае душа – «душа, сатканая з надзей». Калі дабро побач з табой, калі жыццё ў самім табе, ты разумееш гэта шляхам незвычайным і нязведаным. Герой яго вершаў не баіцца цяжкасцей, не баіцца лёсу і крочыць праз гады з верай ва ўсё лепшае ў людзях:

**Нясу ў далонях поціскі сяброў,**
**на вуснах – вуснаў трапяткіх**
**прызнанне,**
**у зрэнках воч – цяпло і спеў**
**кастроў,**
**У сэрцы – ціхай музыкі гучанне.**
**Ні зайздрасці, ні крыўдзе і ні злу**
**мяне не ўзяць у свой палон**
**бурклівы,**
**пакуль я веру людзям і святлу,**
**цвіценню дрэў і калашэнню нівы...**

Віктар Уладзіміравіч не толькі сам піша прыгожыя вершы, але і вучыць таленту нараджаць паэтычныя радкі студэнтаў універсітэта. Створаны на філалагічным факультэце гурток «Крыніца» – сведчанне таму. Творца натхняе студэнтаў убачыць свет прыгожага, дзіўнага, непаўторнага, імкнецца далучыць іх да роднага слова, хараства і непрадказальнасці універсуму, шчодрага на фарбы, гукі, мастацкія вобразы, якія ён сам так тонка адчувае і таленавіта адшуквае.

**А. СІРАЗТДЗІНАВА,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

**Віктар ЯРАЦ**

### *Каляды*

На трасах вецер у абдымкі лезе,
Імчаць па аўтастрадах ноччу й днём
Хто на «Рэно», а хто на «Мэрседэсе»
За доларам, за еўра, за рублём.

Разгублена ўзіраюцца маўкліва
На гэты бег няспынны поле й бор.
Імчыцца век – і надрывае жылы
Ад перагрэву стомлены матор.

Петардамі ўзрываюцца каметы,
Сузор'і ладзяць шоу-феерверк.
Але адкуль плыве, дымком сагрэты,
Каляд пагляд мінулы ў новы век?

І чуецца, як асыпаюць з вецця
Бярозы снег на дол – на ім відна
Палоска лёсу, нібы выклік смерці,
Замовай ад суроку злога дня.

Ляціць вазок між гурбаў. Пад палоззем
Не росчыркі паклёпнага пяра,
Якім старанна пішуцца даносы –
Пасланні да суровага цара.

Імчыць вазок пад небам завірушным.
Яшчэ да Чорнай рэчкі – белы шлях.
І грэе гукі, нібы птушак, Пушкін.
Яшчэ Дантэс фліртуе на балах…

### *Сяргей Ясенін*

Дакранешся да слова –
становіцца песняю слова
і вядзе за сабой
у бярозавы гай малады:
там расу на лістоце
праменні світальныя ловяць
пад гуканне вясны
ў залатыя свае невады.

Дакранешся душой
да крыніц, ручаін і рачулак –
старажытнаю казкай дыхне
таямніца вады
і напоўніцца слых галасамі,
што ў нябёсах знаходзяць прытулак.
…А зязюлі так шчодра вяшчуюць
над ракою Акою гады…

**Алесь БАРАНОЎСКІ,**
**студэнт 3 курса філфака**

### ШАНЦ

Двух шанцаў у жыцці не маем:
Ад Бога дадзены адзін.
На жаль, мы гэта забываем
Праз пяць ці дзесяць мо хвілін…
Жыццё мы можам перамераць,
Узвесіць «супраць» і ўсе «за».
І верыць можам, і не верыць,
Хадзіць па вастрыю ляза.
А ёсць яшчэ такія людзі:
Жывуць на свеце без тугі.
Маўляў, шанц, будзе ці не будзе,
Ды прыйдзе ўсё-такі другі.
Ды шанц адзін… Жыве не вечна,
А, мабыць, некалькі хвілін.
Мне зразумела ўсё, канешне:
Жыць – шанц нам дадзены адзін.

***

Не згіне вера, жыць нанова
Наканаваў ёй цяжкі век.
Яна цярплівасці выснова,
Яе аснова – чалавек.

Няхай ламае бура вецце,
Няхай хвалююцца грамы.
За ўсё, што робіцца на свеце,
Нясём адказнасць толькі мы.

Няхай уяўную сапраўднасць
Хаваем недзе ў глыбіні.
Ідзе, як цень, услед рэальнасць,
Мані сабе ці не мані.

### Трыялет

І хто сказаў, што сэрцу не баліць,
Калі яно заходзіцца ў маўчанні?..
Чакае шчасця з ранку да світання.
І хто сказаў, што сэрцу не баліць?
У такт яго нясмелыя ваганні,
Дзе розум дрэмле, а надзея спіць.
І хто сказаў, што сэрцу не баліць,
Калі яно заходзіцца ў маўчанні?..

**Ганна ДУЛУБ,**
**студэнтка гр. БФЖ-22 філфака**

### БЕЛАРУСАМ

Чаму так мала цэнім слова,
Чаму не можам зразумець,
Што наша светлая, жывая мова
Павінна зоркай зіхацець!

Нашто гаворым мы па-руску –
Не цяжка і па-нашаму сказаць.
На роднай мове, беларускай,
Так мілагучна размаўляць!

Не чую, дзе вы, беларусы?
Хоць бачу ў вачах блакіт
І колер валасоў бялявы, русы,
Але не чую слоў такіх:
«Бывай! Прабачце! Да спаткання!»
Адно кароткае: «Прощай!»
Не чутна раніцою: «Прывітанне!»,
А толькі «Здравствуйте!» ці «Хай!»

Я, можа, з вёскі, не такая?
Магчыма, не сучасная зусім?
На мове сваёй маці размаўляю
І роднага прыхільніца ва ўсім!

**Наталля ТРЫЗНА,**
**студэнтка гр. БФЖ-43 філфака**

### ДАЧКА МІНДОЎГА

Гарыць паганскі Зніч, палае,
Навокал воі-валуны,
Ля іх – ліцвінка маладая
І Далібог. Яны адны.

Здзічэлы вецер, смутак рання,
Глухія сцены і алтар...
То не сустрэча – развітанне,
Бо прагнуць ідалы ахвяр.

І шэпча князь: «Мая красуня,
Цябе я мроіў па начах...»
Убор святочны на Рамуне
І горкі смутак у вачах.

– Адзіны мой, каханы, княжа,
Дзяржаве неабходны мір.
Міндоўг, мой бацька, гэта кажа,
А мне за Шварна – лепш у вір.

Ды гэты шлюб... ён спыніць сечы,
Не будзе кроў зямля ўжо піць,
І сэрца кажа мне, дарэчы,
Што ты таксама будзеш жыць.

Бывай жа – вусны іх шапталі,
Ахвярны выбухнуў агонь,
Дзве знічкі з неба ў снег упалі –
Яе каханне і яго.

### БЕЛАРУСІ ПАЧАТАК

Залатая ялань,
Восень ходзіць па лесе,
Шэрых воблакаў здань
Дождж над пушчай павесіў.

Недалека зіма,
Але хораша, ціха.
Да снягоў, бы вядзьмак,
Спіць пад лісцямі віхар.

Пазяхае ўначы –
Холад цягне з гушчару,
Недзе голле трашчыць,
Хтосьці дыхае жарам.

Рудаватая поўсць –
Дзікоў корміцца статак.
Мо ялань тая – ёсць
Беларусі пачатак.



*Сон до весны.*
*Фото В. ЧИСТИКА.*

**Марына МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка 3 курса філфака**

### Трыялет

Расправіш крылы – і ляціш,
Сцяжынкі неба выбіраеш.
Туды, дзе вецер утрымаеш,
Расправіш крылы – і ляціш.
Сінь палявая, ранку ціш,
І сонца вуснамі кранаеш…
Расправіш крылы – і ляціш,
Сцяжынкі неба выбіраеш.

### Рубаі

На вуснах – усмешка блукае,
У марах – надзея лунае.
Усё пра цябе, мой мілы,
Адзіная думка займае…

***

Добра таму чалавеку, які
мае магчымасць выехаць за мяжу
і атрымаць асалоду ад жыцця за морам.
Прыемна таму чалавеку,
якога клічуць за горы,
каб ён не засяроджваўся
на адным месцы.
Радасна таму чалавеку,
у якога ёсць дзе прыпыніцца,
каб у поўнай меры
ўзяць ад замежнага жыцця ўсе
магчымыя і немагчымыя радасці…
Але сапраўды шчаслівы той чалавек,
які мае месца, куды
ў любы час ён можа
вярнуцца.

**Ганна АНЦЫПОВІЧ,**
**студэнтка гр. РФ-42 філфака**

***

Тое жоўтае лісце, што падае з дрэва,
Ніколі не будзе ўжо зелянець.
Мільгае маланкамі восені грыва,
Не ў сілах ніхто гэты бег прыпыніць.

Ты вечна жыві, калі будзе жаданне,
Не сохні, а толькі квітней.
А я пранясу наша ў сэрцы каханне,
Якое за ўсё даражэй.

***

Легко хорошим быть,
Любить земли творенья,
О грусти позабыть
Хоть на одно мгновенье.

Легко любить весь мир,
Легко дарить улыбки,
Потом устроить пир,
Навек забыв ошибки.

Любить, страдать, мечтать
И думать лишь о счастье,
И голову терять
В порывах пылкой страсти.

Но легче же всего
Ломать, топтать, губить.
Все это для чего?
Зачем жестоким быть?

**Алесь ВЯРЦЕЙКА,**
**студэнт гр. БФ-11 філфака**

***

Як толькі я пабачыў Вас,
Мне стала лёгка на душы,
Як быццам у начной цішы,
Як толькі я пабачыў Вас…
Я вырашыў: пішы, пішы!
І ўслаўляй яе ўвесь час,
Як толькі я пабачыў Вас,
Мне стала лёгка на душы…

***

Што б не здарылася ў жыцці,
Якія б не стрываў ты здзекі,
Паўсюль, заўсёды, назаўжды
Будзь і застанься ЧАЛАВЕКАМ!

**Алексей КОЗАЧЕНКО,**
**студент 4 курса биофака**

***

Запрокинув голову,
Я нырнул в летнее небо
Глубоко. Привкус был горечи
Пережитых волнений, но запах
Был зеленого цвета будущего
счастья.

